ЗАЦВЯРДЖАЮ
Намеснік начальніка упраўлення адукацыі Ваўкавыскага раённага выканаўчага камітэта
П.Я.Красько

ПАЛАЖЭННЕ
аб правядзенні раённага этапу
Рэспубліканскай выставы-конкурсу
дэкаратыўна-прыкладной творчасці
“Саматканы цуд”

Палажэнне аб правядзенні раённага этапу Рэспубліканскай выставы-конкурсу дэкаратыўна-прыкладной творчасці “Саматканы цуд” (далей – выстава-конкурс) распрацаваны ў адпаведнасці з Інструкцыяй аб парадку правядзення рэспубліканскіх мерапрыемстваў установамі дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі з удзелам навучэнцаў, зацверджанай пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 06.07.2011 г. № 59.
АРГАНІЗАТАРЫ:
упраўленне адукацыі Ваўкавыскага раённага выканаўчага камітэта;
дзяржаўная ўстанова адукацыі “Ваўкавыскі цэнтр творчасці дзяцей і моладзі”.
МЭТА І ЗАДАЧЫ:
патрыятычнае і духоўна-маральнае выхаванне навучэнцаў праз іх далучэнне да каштоўнасцей беларускай культурнай спадчыны;
прыцягненне ўвагі дзяцей і творчай моладзі праз сродкі візуальнага мастацтва да народных мастацкіх рамёстваў, традыцыйнага і сучаснага мастацкага тэкстылю;
развіцце дзіцячай творчасці ў галіне дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва;
выяўленне і падтрымка юных талентаў;
матывацыя педагогаў да ўдасканалення свайго прафесійнага майстэрства і інавацыйнага пошуку ў галіне дэкаратыўна-прыкладной творчасці.
УДЗЕЛЬНІКІ:
У выставе-конкурсе прымаюць удзел навучэнцы ўстаноў дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, устаноў агульнай сярэдняй адукацыі, у тым ліку тых, у якіх рэалізуюцца факультатыўныя заняткі мастацкай накіраванасці (далей – установы адукацыі).
Узроставая катэгорыя ўдзельнікаў конкурсу: 6–9 гадоў, 10–13 гадоў, 14–18 гадоў.
ПАРАДАК АРГАНІЗАЦЫІ І ПРАВЯДЗЕННЯ КОНКУРСУ:
Выстава-конкурс праводзіцца ў наступных намінацыях: “Вышыўка”, “Ткацтва”, “Габелен”, “Лямец”, “Вязанне”, “Традыцыйная лялька”, “Сучасная лялька”, “Нацыянальны касцюм”, “Тэкстыльны каллаж”, “Арт-аб’ект”. Работы

павінны быць творчымі і арыгінальнымі ў тэматычным плане, у эксперыментаванні з матэрыялам, мецць яркае і выразнае раскрыццё вобразаў; выкананы акуратна, згодна з тэхналогіямі, у адпаведнасці з кампазіцыйнымі асаблівасцямі.Работы ацэньваюцца ў адпаведнасці з крытэрыямі згодна з дадаткам 3 да дадзеных умоў.

На зваротным баку кожнай работы абавязкова размяшчаецца этыкетка, дзе ўказваецца назва работы; прозвішча, імя і ўзрост аўтара; назва аб'яднання па інтарэсах; прозвішча, імя, імя па бацьку педагога дадатковай адукацыі; поўная назва ўстановы (Дадатак 2).

Работы пераможцаў і прызёраў выставы-конкурсу застаюцца ў рэспубліканскім выставачным фондзе, арганізацыйны камітэт выставы-конкурсу пакідае за сабой права дэманстраваць работы на мерапрыемствах некамерцыйнага характару.

На раённы этап прымаюцца індывідуальныя і калектыўныя работы, розныя па тэматыцы, кампазіцыі і тэхніцы выканання, традыцыйнага і сучаснага напрамку: ткацтва; вышыўка; народныя лялькі, лялькі ў нацыянальным строі; беларускі традыцыйны рэгіянальны касцюм, яго элементы і інтэрпрэтацыі; лямец; тэкстыльная аўтарская лялька; тэкстыльны арт-аб'ект (аб'ёмныя абстрактныя работы). Творчыя работы прадстаўляюцца да 3 студзеня 2025 г. ў дзяржаўную ўстанову адукацыі "Ваўкавыскі цэнтр творчасці дзяцей і моладзі" (вул.Жолудзева 74/4).

ПАДВЯДЗЕННЕ ВЫНІКАЎ КОНКУРСУ:

Пераможцы і прызёры раённага этапу Рэспубліканскай выставы-конкурсу дэкаратыўна-прыкладной творчасці "Саматканы цуд" ўзнагароджваюцца дыпломамі ўпраўлення адукацыі Ваўкавыскага раённага выканаўчага камітэта.

Дадатак 1

САСТАЎ ЖУРЫ
раённага этапу Рэспубліканскай выставы-конкурсу дэкаратыўна-прыкладной творчасці “Саматканы цуд”

| | | |
|---|---|---|
| Паўловіч І.М. | - | загадчык сектара выхаваўчай і сацыяльнай работы ўпраўлення адукацыі Ваўкавыскага раённага выканаўчага камітэта |
| Кухцюк В.М. | - | загадчык аддзела дзяржаўнай установы адукацыі “Ваўкавыскі цэнтр творчасці дзяцей і моладзі” |
| Шышмакова М.А. | - | метадыст дзяржаўнай ўстановы адукацыі “Ваўкавыскі цэнтр творчасці дзяцей і моладзі” |

Дадатак 2

Заяўка да ўдзелу ў выставе-конкурсе дэкаратыўна-прыкладной творчасці "Саматканы цуд"

| № п/п | Назва работы | Прозвішча, імя аўтара, узрост | Назва аб'яднання па інтарэсах | Прозвішча, імя, імя па бацьку педагога | Назва ўстановы |
|---|---|---|---|---|---|
| Намінацыя "Вышыўка" | | | | | |
| 1. | «Конь» | Іваноў Іван, 15 гадоў | аб'яднанне па інтарэсах "Спадчына" | Паўлавец Вольга Мікалаеўна | ДУА "Сярэдняя школа №2 г.Ваўкавыска" |

"Вясна"
Бандарэнка Дзіяна, 10 гадоў
аб'яднанне па інтарэсах "З кветкамі праз стагоддзі"
педагог Бандарэнка Вольга Вітальеўна
ДУА "Цэнтр творчасці дзяцей і моладзі "Крэчут"
г. Крычава

Дадатак 3

Крытэрыі ацэнкі конкурсных работ раённага этапу Рэспубліканскай выставы-конкурсу дэкаратыўна-прыкладной творчасці “Саматканы цуд”

| № п/п | Крытэрыі | Балы |
|---|---|---|
| 1. | Захаванне беларускіх народных рамёстваў | 0-10 |
| 2. | Кампазіцыйнае і каляровае рашэнне | 0-10 |
| 3. | Адзінства стылявога, мастацкага і вобразнага рашэння работы | 0-10 |
| 4. | Арыгінальнасць ідэі, самабытнасць мастацкага ўвасаблення | 0-10 |
| 5. | Спалучэнне традыцыйнай творчасці і сучаснай культуры | 0-10 |
| 6. | Выкарыстанне новых тэхнік і тэхналогій у творчых работах | 0-10 |
| | Максімальная колькасць балаў | 60 |